© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
(ISSN 1819-3625) №5 (2005) стр.110-116

# ЗАВЯЛІКАЯ РАСІЯ

*Яўген Жарабецкі*

У дыскусіях, што распачаліся ва ўкраінскім грамадстве адразу ж пасля ратыфікацыі дамовы пра стварэнне Адзінай эканамічнай прасторы, як правіла, абмяркоўваліся толькі палітычныя і эканамічныя наступствы АЭП. Тагачасная апазіцыя настойвала, што АЭП яшчэ болей аддаліць Украіну ад Еўропы і зруйнуе ўкраінскую эканоміку. Улада ж запэўнівала, што пасля далучэння да АЭП Расія залье Украіну таннымі энерганосьбітамі і сыравінай.

## Імперыя, якая вымірае

Важны аспект АЭП, чамусьці амаль абдзелены ўвагай украінскіх палітыкаў і адмыслоўцаў па праблемах нацыянальнай бяспекі, датычыцца дэмаграфічнага падтэксту гэтага маскоўскага праекта. Сёння ні для каго не ёсць таямніцай, што Расія вымірае. Не нашмат лепшая, зразумела, сітуацыя і ва Украіне, дзе тэмпы дэпапуляцыі нават крыху вышэйшыя, чым у Расіі. Аднак сутнаснае адрозненне паміж гэтымі выпадкамі палягае ў тым, што ў сучаснай РФ збегліся адразу некалькі неспрыяльных дэмаграфічных тэндэнцый, якія ў 1990-х гадах набылі некантраляваны характар і сёння наўпрост пагражаюць самому яе існаванню.

Па-першае, Расія сёння адрозніваецца нізкім, еўрапейскім, узроўнем нараджальнасці і высокім, афра-азіяцім, узроўнем смяротнасці насельніцтва працаздольнага ўзросту. Па-другое, характэрнай ёсць спецыфічная расійская якасць — прагрэсуе выміранне менавіта тытульнай нацыі. У выніку гэтага ў Расіі з кожным годам узрастае ўдзельная вага азіяцкіх народаў, і краіна робіцца ўсё менш славянскай. Трэцяя асаблівасць — гэта надзвычай неспрыяльныя ўнутраныя міграцыйныя працэсы. У выніку прышлае славянскае насельніцтва пакідае расійскую Поўнач і Далёкі Усход, якія паступова засяляюцца нелегальнымі мігрантамі з перанаселенага Кітая. І, нарэшце, чацвёртая асаблівасць — гіганцкі дэмаграфічны выбух у памежных з РФ краінах Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, асабліва ў Кітаі. Гэта стварае каласальны дэмаграфічны ціск на расійскі Далёкі Усход і Прымор’е.

З часу перапісу 13 гадоў таму ў РФ нарадзілася 20,5 млн. чалавек, а памерла 28 млн. «У свеце існуе толькі некалькі краін, насельніцтва якіх вымірае такімі ж тэмпамі, — сказаў прэзідэнт Інстытута нацыялогіі Ігар Суздальцаў. — Дзве з іх размешчаныя ў Афрыцы, прычым адна — Батсвана, у якой 30% насельніцтва інфікавана СНІДам. Тая хуткасць, з якой вымірае насельніцтва Расіі, характэрна хутчэй для ваеннага часу, чым для мірнага перыяду. Перапіс 2002 года паказаў, што мы знаходзімся ў глухім куце, з якога патрэбна тэрмінова шукаць выйсце».

Паколькі няма ніводнай надзеі на тое, што дэмаграфічную сітуацыю атрымаецца палепшыць уласнымі ўнутранымі рэзервамі, расійскае кіраўніцтва мае намер ратаваць дзяржаву коштам знешняй міграцыі, у прыватнасці, з суседніх Украіны, Беларусі і Паўночнага Казахстана. І адна з задач АЭП, якая нідзе і ніколі не афішавалася ні ў расійскай, ні ў еўрапейскай палітычнай аналітыцы, — гэта стымуляванне міграцыйных плыняў з Украіны на сумежныя з Кітаем тэрыторыі Далёкага Усходу. Паспрабуем абгрунтаваць гэтую тэзу.

Расія пасля распаду Савецкага Саюза страціла кантроль над чвэрцю тэрыторыі і паловай ранейшага насельніцтва. Сённяшні значна вышэйшы ўзровень жыцця расіян у еўрапейскай частцы РФ параўнальна з краінамі СНД утрымліваецца толькі дзякуючы спрыяльнай кан’юнктуры на нафту.

На працягу XX стагоддзя насельніцтва Расіі змяншаецца ужо ў чацвёрты раз[1]. Аднак, у адрозненне ад трох папярэдніх хваляў (Першая Сусветная і Грамадзянская войны, наступствы галадамору і калектывізацыі, Другая Сусветная вайна), прычыны сённяшняга скарачэння насельніцтва выключна дэмаграфічныя. Імклівае падзенне нараджальнасці прагназавалася яшчэ 20 гадоў таму, але публічны характар праблема набыла толькі на працягу апошніх часоў. Расійскія і замежныя дэмографы аднолькава канстатуюць яскрава акрэсленую тэндэнцыю да яе абвастрэння і прагназуюць рэзкае змяншэнне натуральнага прыросту насельніцтва РФ.

Па высновах экспертаў ААН, у 2005 годзе насельніцтва Расіі будзе складаць 138 млн. чалавек. Самы песімістычны прагноз Дзяржкамстату РФ прагназуе змяншэнне насельніцтва Расіі да 130 млн. чалавек ужо ў 2016 годзе. Аднак, як сцвярджаюць дэмографы, сапраўды рэальны працэс дэпапуляцыі адбываецца нашмат хутчэй. Так, Е. Андрэеў прагназуе змяншэнне колькасці расійскіх грамадзян праз 50 гадоў да 93 млн.[2]. Тут трэба заўважыць, што ў гэтыя разлікі закладзены патэнцыйны міграцыйны прырост. А без будучых мігрантаў насельніцтва Расіі зменшыцца на той час напалову, а менавіта да 70 млн. чалавек.

Расійскія эксперты ўжо даўно прыйшлі да высновы, што Расія не здольная вырашыць той крызіс, абапіраючыся толькі на ўласны патэнцыял. Таму вырашальнае значэнне ў дзяржаўнай дэмаграфічнай палітыцы РФ надаецца міграцыйнаму чынніку. Варта заўважыць, што менавіта міграцыя (найбольшая ў 1994 годзе — 810 тыс.) і ёсць тым фактарам, які крыху паляпшае кепскія дэмаграфічныя паказнікі РФ. Аднак міграцыя з суседніх краін мае надзвычай ненадзейны характар.

Вось высновы працы «Стратэгія для Расіі»[3], напісанай экспертамі грамадскай Рады знешняй і абарончай палітыкі (СВОП) пад кіраўніцтвам С. Караганава:

«Пасля 2005 года ў Расіі прагназуецца імклівае прыроднае падзенне колькасці працаздольнага насельніцтва, якое можа дасягнуць 1 млн. чалавек у год. Гэта не проста скарачэнне, гэта абвал. Рабочая сіла будзе адным з найдэфіцытнейшых, калі не найдэфіцытнейшым рэсурсам у Расіі. На кароткі прамежак часу — 3–4 гады — падзеннеколькасці працаздольнага насельніцтва можна крыху кампенсаваць шляхам падвышэння пенсійнага ўзросту, аднак такі крок прывядзе да яшчэ больш імклівага змяншэння працаздольнага кантынгенту ў будучыні. Калі Расія пачне стабільна выходзіць з эканамічнага крызісу, адзінай крыніцай папаўнення яе працоўных рэзерваў можа стаць толькі іміграцыя. Такім чынам, перспектыўная міграцыйная палітыка Расіі — гэта, перш за ўсё, іміграцыйная палітыка».

Да сказанага дадамо, што падтрымліваць стабільную плыню мігрантаў у Расію на патрэбным узроўні можна двума спосабамі: або ствараць для іх прывабны клімат у самой Расіі, або мэтанакіравана арганізоўваць невыносныя эканамічныя і палітычныя ўмовы ў краінах-донарах. Няма сумневаў, эксперты СВОП у сваіх прагнозах улічвалі абодва варыянты стымуляцыі знешняй міграцыі ў Расію.

## Завялікая Расія

Іншая, не менш сур'ёзная, праблема, з якой сутыкнулася Расія на пачатку XXI ст., — гэта надзвычай нераўнамерны падзел яе чалавечых рэсурсаў па рэгіёнах. Стан спраў выглядае наступным чынам: агульная плошча сучаснай РФ складае больш за 17 млн. кв. км, а насельніцтва — 145 924,9 тыс. У еўрапейскай частцы Расіі, агульная плошча якой складае 25,2% ад агульнай плошчы РФ (4 309,5 тыс. кв. км), пражывае 114 752 тыс. У азіяцкай частцы, на якую прыпадае 74,8% тэрыторыі РФ (12 765,9 млн. кв. км), — 31 172,9 тыс. чалавек. Шчыльнасць насельніцтва ў еўрапейскай частцы — 26,6 чалавек на 1 кв. км, а за Уралам — 2,4. Яшчэ большая праблема — гэта раёны Крайняй Поўначы і прыраўнаваныя да іх тэрыторыі, якія займаюць 11 900 млн. кв. км (69,7%) і на якіх пражывае 11 533,5 тыс. чалавек. Тут шчыльнасць насельніцтва складае менш за 1 чалавека на 1 кв. км.

Нам застаецца дадаць, што з процілеглага боку мяжы, у Кітаі, шчыльнасць насельніцтва перавышае 130 чалавек на 1 кв. км. Зразумела, што такі велічэзны перапад дэмаграфічнага патэнцыялу стварае на мяжы каласальную напругу, якая рана ці позна скончыцца экспансіяй на новую жыццёвую прастору. З чыйго боку яна будзе ісці — тлумачыць залішне.

---

1 Вишневский А. Г. Демография сталинской эпохи // Население и общество. Информационный бюллетень Центра демографии и экологии человека Института народнохозяйственного прогнозирования РАН. № 70, март-апрель 2003 г. (http://www.demoscope.ru/acrobat/ps70.pdf).

2 Вишневский А. Г., Андреев Е. М., Трейвиш А. И. Перспективы развития России: роль демографического фактора: Научные труды ИЭПП № 53Р. М., 2003. С. 6 (http://www.iet.ru/papers/53/WP53.pdf).

3 Стратегия для России: Повестка дня для Президента-2000. М.: Вагриус, 2000.

Гэтая пахмурная карціна расійскай дэмаграфіі будзе не поўнаю без такога важнага фактару, як унутраная міграцыя ў Расіі. Яе характэрнаю рысаю як у царскі перыяд, так і ў перыяд савецкі, была скіраванасць з захаду на ўсход. Асаблівы дынамізм і размах гэты працэс набыў у сталінскія часы і ў 60-х гадах XX ст. Так, з 1926 па 1959 гады насельніцтва Заходняй Сібіры павялічылася ў 1,5, Усходняй Сібіры — у 2, а Далёкага Усходу — у 3 разы. З 1959 па 1989 гады насельніцтва паўночных рэгіёнаў Сібіры і Далёкага Усходу павялічылася з 1,9 млн. да 4,8 млн., а паўднёвых памежных раёнаў Сібіры — з 20,6 млн. да 27,3 млн. чалавек[4].

Зразумела, што гэты імклівы працэс у надзвычай неспрыяльных прыродных умовах адбываўся не дзякуючы натуральнаму прыросту, а шляхам міграцыі. Донарам для Заўралля выступаў захад СССР, у прыватнасці — Украіна. З моманту асваення Сібіры ў XVI–XVII стст. міграцыя ішла з захаду на ўсход, а рэсурсы — у адваротным напрамку.

Гэтая карціна рэзка змяняецца пасля 1991 года. Распад Савецкага Саюза і разрыў эканамічных і палітычных сувязяў выклікалі адваротныя тэндэнцыі: упершыню з часоў каланізацыі Сібіры і Далёкага Усходу ў XVI–XVII стст. міграцыйныя плыні пайшлі ў адваротным накірунку. Толькі за 10 гадоў існавання новай Расіі яны прывялі да надзвычай важных наступстваў. Упершыню ад часоў свайго засялення Далёкі Усход пачаў губляць насельніцтва. Такім чынам, сёння тэрыторыя Расіі за Уралам, як сцвярджаюць адмыслоўцы, ператварылася ў зону суцэльнага адтоку.

У 2004 годзе Расія расфармавала свае вайсковыя базы на Кубе і В’етнаме, і, за выключэннем постсавецкіх краін і Сірыі, зараз іх за мяжой няма. Тэндэнцыя згортвання расійскай вайсковай прысутнасці ў свеце мае чыста эканамічную прычыну. Аднак зараз Маскве цяжка ўтрымліваць не толькі замежныя вайсковыя базы, але і рэгулярную армію ў самой Расіі. Мы з’яўляемся сведкамі дэградацыі ўзброеных сіл РФ, якая прагрэсуе. Няздатнасць федэральных сіл навесці «канстытуцыйны парадак» у невялікай Чэчні, якая ператварылася для Масквы ў новы Афганістан, сведчыць пра глыбокі крызіс не толькі сілавых структур, але і Расійскай дзяржавы цалкам.

Як гэта ні парадаксальна гучыць, сучасная тэрыторыя РФ занадта вялікая для яе актуальнага эканамічнага і дэмаграфічнага патэнцыялу. З кожным годам Расія мае ўсё большыя праблемы з камплектаваннем асабістага складу і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем сваіх вайсковых гарнізонаў на Поўначы і Далёкім Усходзе. Прагрэс дэпапуляцыі азіяцкай часткі РФ і чаканая экспансія кітайцаў ставіць расійскае кіраўніцтва перад надзвычай вострай праблемаю: як забяспечыць салдатамі і афіцэрамі свае межы за Уралам.

Калі сучасныя дэмаграфічныя тэндэнцыі і надалей захаваюць існыя характар і дынаміку, то праз 30–40 гадоў федэральныя войскі вышэй 60-й паралелі апынуцца ў практычна бязлюднай мясцовасці, а на поўдні сваёй краіны — у чужым моры кітайскага насельніцтва, што азначае — на безумоўна варожай тэрыторыі. Кошт утрымання такіх гарнізонаў рэзка ўзрасце — з адпаведнымі наступствамі для расійскай эканомікі. Далей — скарачэнне гэтых гарнізонаў да сымбалічнай колькасці і паступова — фактычная страта кантролю Цэнтра над гэтымі тэрыторыямі.

Усведамляючы небяспеку хранічнага недабору прызыўнікоў для ўзброеных сілаў РФ, Дума прыняла закон пра кантрактны набор іншаземных грамадзян у расійскую армію[5], спадзеючыся на славянскую дыяспару ў паўночным Казахстане, Украіну і Беларусь. Аднак сярод славян выявілася няшмат ахвотнікаў за некалькі соцень даляраў у месяц ваяваць у Чэчні. А гучна разрэкламаваная кампанія ціха сканала.

## Запраграмаваная дэпапуляцыя

Нестабільнасць дэмаграфічнай сітуацыі ў Расіі даволі выразна прадэманстраваў апошні перапіс насельніцтва 2002 года, вынікі якога нават некаторыя расійскія адмыслоўцы лічаць сфальсіфікаванымі. Адпаведна вынікам, атрыманым Дзяржкамстатам у ходзе перапісу[6], у Расіі пражывае 145,3 млн. чалавек. Гэта на 2 млн. чалавек больш, чым прагназавалі дэмографы. «Розніца паміж чаканаю велічынёй і той, якая была агучаная Дзяржкамстатам, занадта вялікая, каб яе можна было спісаць на хібнасць», — заявіў кіраўнік Цэнтра па вывучэнні праблем народанасельніцтва ІНП РАН В. Елізараў. Дэмографы не выключаюць, што мае месца звычайная прыпіска. «Як бачна, Дзяржкамстат адчувае пэўны страх прадставіць не тыя дадзеныя, якія чакае ўрад, — лічыць В. Елізараў. — Усе памятаюць 1937 год, калі вынікі перапісу выявіліся не такімі, як чакала-

4 Зайончковская Ж. Демографическое будущее Сибири и Дальнего Востока // Структура и динамика регионального расселения Российской Федерации / Институт географии РАН. М.: О. Г. И., 2003.

5 Арт. 32 Закона Расійскай Федэрацыі «О воинской обязанности и военной службе» ад 28 сакавіка 1998 года, № 53-ФЗ.

6 www.perepis2002.ru

ся: яны былі засакрэчаныя, а арганізатары перапісу расстраляныя»[7].

Варта адзначыць, што ў расійскай прэсе пасля перапісу 2002 года з'явіўся шэраг даволі жорсткіх публікацый і каментараў, якія распавядаюць пра тэхналогію і прычыны фальсіфікацыі перапісу. Так, расійская газета «Новые Известия» нечакана апублікавала папярэднія дадзеныя перапісу, якія ставяць пад сумнеў афіцыйныя вынікі[8]. Калі верыць гэтым дадзеным, сёння ў Расіі жыве больш кітайцаў і в'етнамцаў, чым казахаў, таджыкаў, узбекаў, туркменаў, кіргізаў, грузін і малдаван, разам узятых, — больш за 4 млн. чалавек. Па прагнозах адмыслоўцаў, да 2015 года кожны чацвёрты жыхар РФ будзе кітайцам.

Загадчыца лабараторыі міграцыі Інстытута прагназавання народнай гаспадаркі РАН прафесар Ж. Зайанчкоўская не выключае прыпісак да колькасці тытульнага насельніцтва ў большасці нацыянальных рэспублік: «Пасля дзвюх войнаў і шматлікіх стратаў у Чэчні не можа пражываць 1,3 млн. чалавек. Адмыслоўцы нашага інстытута займаюцца дэмаграфічнымі прагнозамі. Ужо ўзгоднена з Дзяржкамстатам тое, што канчатковыя дадзеныя па Чэчні будуць зменшаныя на некалькі соцень тысяч»[9].

Несумнеўным, на наш погляд, ёсць той факт, што расійская дэмаграфічная рэальнасць выявілася настолькі пахмурнаю і пагрозліваю для бяспекі дзяржавы, што Маскве не засталося нічога іншага, як проста засакрэціць рэальны стан спраў.

Мяркуючы па ўсім, сённяшнія расійскія аналітыкі і эксперты, якія займаюцца стратэгічнымі праблемамі развіцця Расіі, здолелі пераканаць Крэмль у тым, што савецкая палітыка штучнага засялення Расійскай Поўначы памылковая з пункту гледжання выкарыстання і без таго недастатковага дэмаграфічнага рэсурсу краіны. Больш за тое, яна з'яўляецца смяротнаю для нацыянальнай эканомікі. Рызыкнем дапусціць, што яны ўжо даўно ўсвядомілі: з-за дэпапуляцыі, якая прагрэсуе ў цэнтры Расіі, і дэмаграфічнага выбуху ў суседнім Кітаі і краінах АТР, утрымаць кантроль над сучаснай тэрыторыяй за Уралам можна толькі часткова і толькі на працягу даволі нязначнага перыяду — максімум 50 гадоў.

Практычна гэта азначае, што ў перспектыве за Уралам у выніку прыроднага вымірання і ўнутранай міграцыі адсотак славянскага насельніцтва няўхільна змяншаецца, а колькасць азіяцкага — павялічваецца. З другога боку, гэтая тэрыторыя, калі будуць поўнасцю вычарпаныя энерганосьбіты і карысныя выкапні, атрымае адносную незалежнасць ад Масквы. Без прыродных рэсурсаў і славянскага насельніцтва. А далей — справа за Кітаем.

Гэтым і тлумачыцца той факт, што ўсе сацыяльныя і эканамічныя праграмы сібірскіх навукоўцаў, скіраваныя на стрыманне адтоку насельніцтва з Сібіры, паслядоўна і мэтанакіравана тарпедуюцца Цэнтрам. Напрыклад, навасібірскія адмыслоўцы, якія традыцыйна займаюцца складаннем такіх праграм, прапануюць Ураду РФ распрацаваць федэральныя праграмы для міграцыі расійскага і славянскага насельніцтва, капіталаў і тэхналогій з еўрапейскай часткі РФ ва Усходнюю Сібір і на Далёкі Усход, ствараючы асабліва спрыяльныя ўмовы для прыватнай эканамічнай дзейнасці, па прыкладзе афшорных зон з адмысловым рэжымам падаткаабкладання і гаспадарання. Навасібірск прапануе таксама забяспечыць поўны кантроль над іміграцыйнымі плынямі з Кітая шляхам усталявання квот на пэўныя віды прафесій, зыходзячы з мэтазгоднасці і патрэбаў народнай гаспадаркі. Аднак, калі ўважліва азнаёміцца са станам рэалізацыі федэральных праграм паляпшэння сацыяльных і эканамічных умоў Усходняй Сібіры і Далёкага Усходу, то можна пабачыць дзіўную заканамернасць. Большасць з іх згортваецца па ўказанні Цэнтра не таму, што не хапае фінансаў (бюджэт РФ, як правіла, выдзяляе да 25% агульнага фінансавання), а з-за недахопу яго цікавасці да рэалізацыі гэтых праграм. Масква ахвотна знаходзіць грошы для перасялення жыхароў Поўначы і Далёкага Усходу ў еўрапейскую частку краіны, аднак катэгарычна адмаўляецца скасоўваць некаторыя віды падаткаў для прыкардоннага расійскага бізнесу і пошліну на экспарт у Кітай. З другога боку, рэалізуюцца толькі праграмы, задачай якіх ёсць пашырэнне і мадэрнізацыя энергетычнай і горна-здабывальнай галін вытворчасці.

Знішчаецца сацыяльная інфраструктура — школы, лякарні, садкі, установы культуры і адпачынку, утрыманне якіх непасільным цяжарам ляжала на прамысловай вытворчасці. У той жа час

7 Всесоюзная перепись населения 1939 года. Основные итоги / Российская Академия Наук. Научный Совет по исторической демографии и исторической географии. Институт Российской истории. Управление статистики населения Госкомстата. М.: Наука, 1992; Жиромская В. Б., Киселев И. Н., Поляков Ю. А. Полвека под грифом «секретно»: Всесоюзная перепись населения 1937 года. М.: Наука, 1996.

8 Тимашова Н., Викторова А., Сусаров А., Поздняев М. Россия китайская. Национальная карта страны за последние годы резко изменилась // Новые Известия, 5 сентября 2003 г.

9 http://flb.ru/info/20651.html

чалавечая дзейнасць канцэнтруецца навокал прадпрыемстваў здабычы і перапрацоўкі. Рабочая сіла на іх паступова пераходзіць на вахтавы рэжым працы.

Такім чынам, у Расіі вышэй за 60-ю паралель паступова знікаюць паселішчы і невялікія гарады. А цывілізацыя, у еўрапейскім разуменні гэтага слова, захоўваецца ў паселішчах, размешчаных паблізу вялікіх радовішчаў нафты, газу, нікелю ці алюмінію. Таму ў хуткім часе на Поўначы будуць жыць толькі вахтавікі і тубыльцы.

Таксама варта адмыслова акцэнтаваць, што сцэнар дэпапуляцыі расійскай Поўначы актыўна лабіруюць расійскія нафта-газавыя, алюмініева-нікелевыя і іншыя прыватныя здабывальныя карпарацыі, якія прагнуць зменшыць уласныя выдаткі на ўтрыманне невытворчага сектара. Яны ж фінансуюць магутныя аналітычныя цэнтры і падкантрольныя СМІ, якія ажыццяўляюць аналітычнае і інфармацыйнае суправаджэнне працэсу дэпапуляцыі Поўначы. Нарэшце патрэбна прызнаць: з пункту гледжання аптымізацыі вытворчасці — альтэрнатывы гэтаму шляху няма. Іншая справа, што дзякуючы такому сцэнару расіяне Сібір усё ж такі страцяць.

З іншага боку, поўдзень Сібіры, Прымор'я, тэрыторыі ўздоўж расійска-кітайскай мяжы патрабуюць кардынальна супрацьлеглага сцэнару — тэрміновага павелічэння насельніцтва. Варта таксама памятаць пра тое, што Далёкаўсходні рэгіён заўсёды залежаў ад субсідый з Масквы, якія перасталі прыходзіць пасля распаду СССР. Мясцовая ўлада заплюшчвала вочы, калі насельніцтва прадавала кітайцам металалом, цэмент і ўвогуле ўсё, што магло прадаць, атрымаўшы за тое прадукты і адзенне. «Кітайцам няма патрэбы фізічна заваёўваць Далёкі Усход, бо яны ўжо заваявалі яго эканамічна», — гаворыць супрацоўнік Федэральнай эміграцыйнай службы Р. Рожанска[10].

Каб супрацьстаяць некантраляванаму наплыву нелегальных мігрантаў з Кітая, патрэбна ўпарадкаваць памежны рэжым і кантроль за знаходжаннем кітайскіх грамадзян на тэрыторыі Расіі і тэрмінова павялічыць колькасць славянскага насельніцтва ў памежных з КНР раёнах.

Першую палову задачы вырашыць практычна немагчыма вось чаму: расійска-кітайская мяжа яшчэ з савецкіх часоў абсталявана даволі добра, чаго нельга сказаць пра казахстанска-расійскую мяжу працягласцю больш за 6 тысяч кіламетраў. Менавіта праз гэтую вялікую дзірку, як сцвярджаюць расійскія эксперты, і патрапляе ў Расію асноўная маса нелегальных мігрантаў з Кітая.

Што ж датычыцца засялення Далёкага Усходу славянамі, то планавалася накіраваць высяленае з Поўначы насельніцтва не толькі ў еўрапейскую частку Расіі, але і ў Прымор'е, і на Далёкі Усход. Рэалізаваць гэты план, аднак, не атрымалася: толькі 15% перасяленцаў асядае на Далёкім Усходзе. Асноўная ж маса мігруе ў еўрапейскую частку РФ, на Паўночны Каўказ і ва Украіну. Так, з 1989 года гэтыя рэгіёны пакінулі каля 6 мільёнаў грамадзян, а таму і не дзіўна, што вызваленыя землі пачалі актыўна засяляць жыхары сумежных тэрыторый КНР. Сёння, як сцвярджаюць расійскія адмыслоўцы, афіцыйныя лічбы кітайскіх эмігрантаў не выклікаюць ніякага занепакаення. З другога боку, рэальнай колькасці кітайцаў у Расіі і, галоўнае, дынамікі і характару гэтага працэсу не ведае ніхто: расійскія далёкаўсходнія статыстычныя органы свядома заніжаюць дадзеныя ў сваіх справаздачах. Па некаторых крыніцах, у самой толькі Маскве сёння налічваецца больш за 100 000 кітайцаў[11]. У цэлым, прагназуецца, што праз 50 гадоў у РФ будзе больш за 10 млн. грамадзян Паднябеснай і яны стануць другім па колькасці народам «славянскай» краіны — гэта ў лепшым выпадку. У горшым — на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў кітайская дыяспара ў Расіі дасягне дзесяткаў мільёнаў, і пытанне незалежнасці Далёкага Усходу і паўднёвасібірскіх рэгіёнаў Кітая будзе вырашана выключна мірным шляхам.

## Сталінскім шляхам

І дэмографы, і кіраўніцтва Расіі ўсведамляюць, што павялічыць колькасць насельніцтва прыродным чынам нерэальна. Асноўная праблема, на думку адмыслоўцаў, палягае ў звышвысокім узроўні смяротнасці для краіны, якая лічыць сябе развітаю. Калі на Захадзе галоўнымі прычынамі смяротнасці з'яўляюцца сардэчныя і анкалагічныя захворванні, то ў Расіі завялікая доля прыпадае на няшчасныя выпадкі на вытворчасці і ў быце, а таксама на алкагалізм. Галоўны санітарны лекар РФ Г. Анішчанка апрылюдніў такія дадзеныя: кожны год у краіне памірае больш за мільён людзей, у т. л. 600 тысяч — у працаздольным узросце. Усё гэта на 80% — мужчыны. Па стандартах САЗ, сітуацыя ў краіне становіцца не-

---

[10] Fulford Benjamin. When worlds collide. Russia's desolate Far East looms more enticing as a granary — a homegrown one — for crowded and hungry China // Forbes, February 17, 2003.

[11] «Вести.ру» ад 02.02.2002 змясцілі наступнае паведамленне са спасылкай на намесніка галавы адміністрацыі прэзідэнта Расіі Віктара Іванова: «Из 200 тысяч китайцев, находящихся в Москве, на учете состоят только 350 [человек]».

бяспечнаю тады, калі сярэднегадовае спажыванне алкаголю (у пераліку на спірт) перавышае 8 літраў на чалавека. Сённяшні расійскі паказчык, што ў 1999 годзе складаў 16,5 літраў, набліжаецца, як сцвярджае Г. Анішчанка, да 20 літраў[12].

Колькасць насельніцтва скарачаецца катастрафічнымі тэмпамі, а палітыка, скіраваная на падвышэнне ўзроўню нараджальнасці, занадта пасіўная, каб хоць неяк змяніць сітуацыю. Як лічаць расійскія адмыслоўцы, прынцыпова выправіць сучасную сітуацыю немагчыма. Можна толькі падкарэктаваць яе і стабілізаваць падтрымку насельніцтва, каб запаволіць рост смяротнасці. У іншым выпадку дэмаграфічны крызіс прывядзе да скрайне негатыўных наступстваў, у першую чаргу ў эканоміцы краіны.

Максімальна адкрыта сфармуляваў намеры Масквы ў дачыненні да «брацкіх» славянскіх народаў кіраўнік Цэнтра дэмаграфіі і экалогіі чалавека А. Вішнеўскі: «Каб змяніць сітуацыю, неабходна павялічыць колькасць дзяцей у Расіі ўдвая, і надоўга. Аднак гэта немагчыма: такой нараджальнасці няма ні ў якой іншай развітой краіне. Тым больш сёння палітыка дзяржавы не скіраваная на падтрымку інстытута сям'і. Адзіная магчымасць папоўніць колькасць насельніцтва ў нашай сітуацыі — стымуляваць знешнюю міграцыю. Толькі тады, калі мы будзем прымаць кожны год ад 700 тысяч да 1 мільёна мігрантаў, у нас атрымаецца нейкім чынам стрымаць імклівае змяншэнне насельніцтва Расіі. У гэтай сітуацыі прыярытэтнае заданне Расіі сёння — «выбраць» усе прывабныя людскія рэсурсы з славянскіх рэспублік былога СССР, а таксама з Казахстана»[13].

Ужо ў 2006 годзе пачнецца хуткае зніжэнне колькасці працаздольнага насельніцтва. Гэта аўтаматычна прывядзе да ўзрастання працоўнай нагрузкі на тых, хто працуе. З гэтага часу насельніцтва краіны хутка пачне старэць і рэзка змяншацца. І тады ўжо аніякія кардынальныя рэформы не змогуць выправіць сітуацыю: у Расіі пачнецца дэмаграфічная катастрофа. Гэта непазбежна прывядзе да рэзкага эканамічнага і палітычнага пагаршэння ў краіне.

Такім чынам, на думку дэмографаў і статыстыкаў, уладзе нічога не застаецца, як пачаць актыўную стымуляцыю стабільных міграцыйных плыняў з краін СНД — дзеля ўратавання дзяржавы. Па некаторых дадзеных, напрыканцы сакавіка 2004 года В. Пуцін правёў адмысловае закрытае паседжанне Рады бяспекі РФ, прысвечанае складанай дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне. Прысутныя выказалі глыбокую занепакоенасць тым, што яна паступова выходзіць з-пад кантролю і мае ўсе адзнакі незваротнасці. Я. Прымакоў выступіў з заявай пра неабходнасць заахвочваць эміграцыю ў Расію і прапанаваў улічыць поспехі іміграцыйнай палітыкі іншых дзяржаў. У прыватнасці, Ізраіля, чый досвед асабліва каштоўны: ён накіраваны на пабудову менавіта нацыянальнай дзяржавы — а не касмапалітычнага «плавільнага казана», якім заўсёды былі ЗША, а зараз сталі краіны Еўразвязу.

РФ прызнала, што найбольш каштоўным стратэгічным «рэзервам» для Расіі з'яўляюцца яе былыя грамадзяне — этнічныя расіяне ці іх нашчадкі, раскіданыя па ўсім свеце; іх колькасць, па розных падліках, сягае ад 7 да 12 мільёнаў. Менавіта этнічная расійская дыяспара, у адрозненне ад рускамоўных грамадзян «бліжняга замежжа», магла б даць магутны імпульс эканамічнаму ўздыму краіны. Па выніках паседжання В. Пуцін даручыў прэм'ер-міністру М. Фрадкову да 1 чэрвеня распрацаваць канкрэтную праграму заахвочвання рэпатрыяцыі расіян, якія ў розны час пакінулі Расію ці з'яўляюцца нашчадкамі эмігрантаў. Былі планы, што тым, хто вернецца, дзяржава аплаціць транспартныя выдаткі, прадставіць беззваротную дапамогу для набыцця жытла, розныя ільготныя пазыкі. Гэтыя выдаткі, як планавалася, будуць залежаць ад рэгіёна краіны. Максімальна выгодныя ўмовы атрымаюць тыя, хто асядзе ў стратэгічна важных рэгіёнах уздоўж паўднёвай мяжы Расіі — у Хабараўскім краі і Амурскай вобласці. Прэзідэнт Пуцін акцэнтаваў, што выдаткі на рэпатрыяцыю суайчыннікаў, большасць з якіх пакінула краіну праз недальнабачную палітыку папярэдняй улады, шчодра акупяцца. Менавіта зараз, калі краіна назапасіла вялікія золатавалютныя рэзервы дзякуючы высокім коштам на нафту, наспеў час выправіць памылкі папярэднікаў.

Скептычны чытач, несумнеўна, заўважыць, што толькі адных указаў прэзідэнта Пуціна і пастаноў яго ўрада замала для таго, каб жыхары Украіны і Беларусі ўсё кінулі і перабраліся на Далёкі Усход ці ў Прымор'е. Парадокс, аднак, палягае ў тым, што нават сёння, пры пакуль што даступных коштах на энерганосьбіты і задавальняльным узроўні жыцця ва Украіне, найбольшы прыток мігрантаў у Расію ідзе з нашай краіны. Асядаюць яны, што праўда, у цэнтральнай частцы і на поўдні РФ. І, як заўважыў В. Пуцін, Расія павінна браць

---

12 Домнышева Е. Великий мор. Почти по всей России смертность стала превышать рождаемость // Новые Известия, 9 октября 2003 г.

13 Попова А. Россия борется со смертью // «RBC daily», 16 февраля 2004 г.

прыклад з Канады, якая не толькі ўсталявала квоты на прыняцце імігрантаў адпаведна да іх прафесій, але і вырашае, дзе менавіта яны павінны жыць. Такім чынам, кіраваць міграцыйнымі працэсамі ўсярэдзіне краіны ўсё ж такі можна.

## Паміж імперыяй и хаосам

АЭП — праект, безумоўна, шматмэтавы. Мы не будзем разважаць пра палітычныя і эканамічныя наступствы стварэння так званай «Адзінай эканамічнай прасторы», паколькі гэты артыкул прысвечаны іншай тэме. Аднак мы павінны выказаць меркаванні, без якіх немагчыма яе завяршыць.

Першае. Галоўная палітычная задача АЭП, як гэта відаць няўзброеным вокам, — рэстаўраваць (прынамсі, на нейкі час) Расійскую імперыю, папярэдне ізаляваўшы Украіну ад Еўразвязу. Трэба памятаць, што гэты праект, не зважаючы на гучную рыторыку ў еўрапейскіх СМІ, рэалізуецца пры поўным паразуменні і спрыянні такіх «цэнтраў» Еўразвязу, як Нямеччына і Францыя.

Гэты факт, па нашых назіраннях, стаў поўнаю нечаканасцю для шараговага грамадзяніна Украіны. Тым часам заслона, якую еўрапейцы адбудавалі на нашых заходніх кардонах, прымусіць украінскіх беспрацоўных і ўкраінскі капітал (згадайце прыватызацыю польскай Гуты Чэнстаховай) шукаць сабе прымяненне ў процілеглым напрамку, у Расіі.

Другое. Сёння можна са стоадсоткавай упэўненасцю казаць пра тое, што Масква ніколі не пойдзе на стварэнне зоны вольнага гандлю без выключэнняў і абмежаванняў, за якія так выступаў Л. Кучма. Аднолькавы для ўсіх удзельнікаў АЭП кошт энерганосьбітаў азначае немінучую смерць расійскай эканомікі. Бо энергавыдаткі на вытворчасць адзінкі прадукцыі ў Расіі нашмат большыя, чым ва Украіне.

Наадварот, нават калі адбудзецца цуд і кошт энерганосьбітаў будзе без экспартных тарыфаў і пошлін, — усё адно расіяне нешта прыдумаюць, каб зберагчы існы дыспарытэт цэн. Напрыклад, штучна створаць дэфіцыт паліва на нашым рынку, што аўтаматычна прывядзе да падвышэння цэн ва Украіне.

Што яны будуць рабіць? Для пачатку падвысяць кошты на энерганосьбіты да сусветнага ўзроўню: 5–7 грывен за літр бензіну, 130 даляраў за 1000 куб. м газу, — «забудуць» завезці ядзернае паліва на ўкраінскія АЭС. Зразумела, што эканоміку Украіны чакае сапраўдны калапс з усімі наступствамі: поўным спыненнем вытворчага і жыллёва-камунальнага сектараў, шалёнымі коштамі на прадукты харчавання, некантраляваным ростам дзяржаўнай запазычанасці за спажытыя расійскія энерганосьбіты. Большасць збанкрутаваных украінскіх прадпрыемстваў апынецца ў расійскіх руках. Апошняе, аднак, зусім не азначае, што яны адразу ж запрацуюць на поўную магутнасць. Досвед прыватызацыі некаторых прадпрыемстваў у Галіччыне сведчыць пра адваротнае. Далей — прыватызацыя ўкраінскіх нафтагазавых транзітных трубаправодаў, ліній электраперадач і партоў за дзяржаўную запазычанасць.

Мэта гэтага маштабнага аваподвання ўкраінскай уласнасцю (прынамсі, напачатку) — максімальна знізіць узровень жыцця шараговага грамадзяніна Украіны, стварыць непрымальныя ўмовы для любой бізнес-актыўнасці ў вытворчасці, зрабіць непрыбытковым бізнес і невыносным побыт. Заходні напрамак прадбачліва перакрылі Шырак са Шродарам. Таму найбольш актыўная і маладая частка ўкраінцаў рушыць да расійскіх консульстваў. Дзе іх ужо будуць чакаць бясплатныя квіткі ў Забайкальск, Благавешчанск ці Камсамольск-на-Амуры.

Калі запрапанаваны варыянт развіцця падзей падасца камусьці занадта фантастычным, раю яшчэ раз азнаёміцца з коштамі на найбліжэйшай запраўцы ТНК ці «Лукойла». Варта таксама прыгадаць неацэнны досвед выжывання грузін узімку без газу і электраэнергіі — пасля таго, як Чубайс на пні скупіў іх энергетычную сістэму.

Пры ўсёй неймавернасці і дзікасці прадстаўленага сцэнару, хочацца нам таго ці не, ён мае ўсе шанцы быць рэалізаваным. Аднак адзначым, што, нягледзячы на цяжкую дэмаграфічную сітуацыю, Украіна знаходзіцца ў лепшых умовах, чым Расія. У адрозненне ад Расіі, якая мяжуе з Кітаем, нас акружаюць краіны з нізкім (або нулявым) прыростам. Маштабная знешняя нелегальная міграцыя нам не пагражае. Варта толькі навесці ў краіне такі-сякі парадак, і міграцыйны адток насельніцтва з Украіны істотна зменшыцца. Наадварот, досвед невялікіх краін Прыбалтыкі ці рэвалюцыйныя падзеі ў Грузіі ясна паказваюць, што цяперашняя Расія навейвае рэальны страх толькі тым, хто сам не хоча ёй супрацьстаяць.

Што трэба рабіць у гэтай сітуацыі — тлумачыць залішне.

*Пераклала з украінскай Таццяна Кавальчук паводле: Євген Жеребицький. Завелика Росія // ЄвроАтлантика. 2005, № 1. С. 66–71.*